# Ідуць экзамены! Студэнты БДУ, парадуем Радзіму высокімі ведамі!


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

АРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 19 (528) Субота, 1 чэрвеня 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы


## Практыка вылічальнікаў

Ужо каля двух месяцаў студэнты 4 курса матэматычнага факультэта праходзяць вытворчую практыку ў вылічальных цэнтрах горада Мінска. Вялікая група студэнтаў практыкуецца ва універсітэцкім вылічальным цэнтры. Аб іх цікавай рабоце я хачу расказаць.

Матэматык-вылічальнік, праграміст. Той, хто не ведае гэтай работы, параўноўвае яго працу з працай бухгалтара. Але гэта далёка не так. Паглядзім, чым займаюцца студэнты нават у першы перыяд вытворчай практыкі.

«Разлік аптымальных параметраў тэрмадынамічнага цыкла парагазавай і газатурбіннай ЦЭЦ» — над такой тэмай працуе чацвёракурснік Р. Жаўняк. Распрацоўкай некаторых праблем па аўтаматычнаму пілатаванню занята В. Кулакоўская. Я. Дземідовіч распрацоўвае метад гідраўлічнага разліку кальцавых водаправодных сетак, па якому ў далейшым будзе рабіцца разлік патокаў вады ў водаправоднай сетцы Мінска. Цікавая тэма работы і ў студэнтаў А. Васільца, Р. Манько, Р. Ажгірэя.

І ўсё ж, што галоўнае ў рабоце вылічальніка? Гэта самастойная распрацоўка метада рашэння той ці іншай праблемы, задачы. Непасрэдна праграміраванне ў студэнтаў лічыцца элементарнай работай. На вылічальнай машыне яны працуюць усё часцей самастойна. І работа захапляе іх. Да позняга вечара працуюць яны ў лабараторыях вылічальнага цэнтра. Імкнуцца як мага хутчэй давесці работу да канца. А яны ж яшчэ і экзамены здаюць!

Але сесію здаваць трэба. І студэнты вымушаны будуць пераключыцца на падрыхтоўку да экзаменаў, парапыняць многія работы. Ці добра гэта? Дэканату матэматычнага факультэта трэба было б падумаць аб перанясенні экзаменаў за рамкі практыкі. Каб студэнт меў магчымасць поўнасцю прысвяціць сябе практыцы, не раскідваючы сваёй увагі.

Кіраўнікі практыкі вельмі станоўча адгукаюцца аб рабоце студэнтаў А. Ванагель, М. Разанцавай, К. Трапейкі, А. Васільца, Н. Цюніс, Г. Сілкінай, Р. Манько, Р. Ажгірэя, Р. Жаўняка і многіх іншых.

На наступным этапе практыкі студэнты перайдуць да самастойнай работы, блізкай да той, з якой яны сутыкнуцца пасля заканчэння універсітэта.

**Г. ДРАБУШЭВІЧ,**
інжынер вылічальнага цэнтра.

## А што скажа Савет СНТ?

Мне давялося пабываць на студэнцкай навуковай канферэнцыі ў Чарнавіцкім дзяржаўным універсітэце, выступаць на ёй з дакладам. Вярнуўшыся ў Мінск, я удзельнічаў у рабоце канферэнцыі і ў нашым універсітэце. Вельмі крыўдна, але параўнанне гэтых канферэнцый зусім не ў нашу карысць.

У Чарнавіцкім універсітэце канферэнцыя пачыналася з сумеснага ўрачыстага пасяджэння усіх секцый. У актавай зале ЧДУ канферэнцыю адкрыў рэктар універсітэта прафесар Леуцкі. Потым пачаліся пасяджэнні студэнтаў па секцыях—кожны факультэт, кожнае аддзяленне паасобку.

Я удзельнічаў у рабоце секцыі гістарычных навук. Усяго было тры пасяджэнні. На першым былі заслуханы і абмеркаваны 5 дакладаў. Тэматыка іх —гісторыя Букавіны (Чарнавіцкай вобласці). 6 дакладаў на другім пасяджэнні былі прысвечаны гісторыі Букавіны і Украіны. На трэцім пасяджэнні былі заслуханы таксама 6 дакладаў, на гэты раз па ўсеагульнай гісторыі.

Усе пасяджэнні праходзілі ў дзелавой, рабочай абстаноўцы. Кожны дакладчык выступаў па 20—30 мінут. Абмеркаванне дакладаў і адказы дакладчыкаў на пытанні праводзіліся ў канцы пасяджэнняў. Усяго на трох пасяджэннях прысутнічалі 170 студэнтаў, г. зн. на кожным пасяджэнні было па 55—60 чалавек. А ўсяго ж на гістфаку ЧДУ займаецца каля 110 студэнтаў. У нашым універсітэце навучаюцца ўдвая больш будучых гісторыкаў, але аб такой колькасці прысутных на канферэнцыі, аб такой колькасці дакладаў нам толькі марыць застаецца. Ды і падрыхтоўка дакладаў у нас намнога слабейшая.

Потым адбылося ўрачыстае закрыццё студэнцкай навуковай канферэнцыі. Былі падведзены вынікі работы канферэнцыі і студэнцкага навуковага таварыства. У канцы заключнага пасяджэння цэлую гадзіну студэнтам, зрабіўшым лепшыя даклады, уручалі граматы і падарункі — кнігі.

Я думаю, што было б мэтазгодна і нашы студэнцкія навуковыя канферэнцыі праводзіць у агульнауніверсітэцкім маштабе, ператвараць іх у сапраўдныя святы навукі. Універсітэт у час правядзення канферэнцыі павінен займацца навукай і толькі навукай. Усе іншыя мерапрыемствы, якія адцягваюць увагу студэнтаў, павінны пераносіцца на іншы час.

Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна — буйнейшая кузня кадраў нашай рэспублікі. Так давайце ж паднімем навуковую студэнцкую работу ў ім сапраўдную вышыню!

**В. НАСЦЮШОНАК,**
студэнт 3 курса гістфака,
член НСТ факультэта.

Ад рэдакцыі. Рэдакцыя і чытачы «Беларускага універсітэта» чакаюць ад уноў выбранага Савета СНТ універсітэта канкрэтнай размовы аб пытаннях арганізацыі студэнцкіх навуковых канферэнцый у БДУ. Трэба спадзявацца, што да наступнай агульнауніверсітэцкай канферэнцыі СНТ універсітэта падрыхтуецца ўзорна, тым больш, што для гэтага ўпаўне дастаткова часу — дзесяць месяцаў.

## Па універсітэту

*Сем з палавінай месяцаў працягвалася чытанне лекцый «Майстры замежнага мастацтва», арганізаваных Мінскім гарадскім аддзяленнем таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў і Дзяржаўным Эрмітажам. Слухачы пазнаёміліся з творчасцю Леанарда да Вінчы, Рафаэля, Веласкеса, Рубенса і іншых выдатных дзеячоў мастацтва. Апошняя, 17-я лекцыя адбылася ў актавай зале універсітэта ў мінулы аўторак.*

*У сераду ў актавай зале галоўнага корпуса адбылося выступленне дыктара Усесаюзнага радыё, заслужанага артыста РСФСР Юрыя Левітана — «Гаворыць Масква».*




## 11,5 км паліц

У галоўным корпусе універсітэта закончан мантаж металічных бібліятэчных стэлажоў. Бібліятэка універсітэта атрымала першакласныя сучасныя стэлажы, выробленыя на Карачараўскім механічным заводзе. Дарэчы, у нашай рэспубліцы гэта пакуль што першыя і адзіныя такога тыпу стэлажы. Яны будуць служыць доўгія гады без усялякага рамонту.

Новыя стэлажы вельмі зручныя ў рабоце. Бібліятэчныя работнікі без усялякіх намаганняў змогуць перасоўваць паліцы ў залежнасці ад фармату кніг. Стэлажы пафарбаваны ў прыемны для вока светлы колер. Агульная працягласць паліц на стэлажах — 11,5 кіламетра. На іх можна размясціць паўмільёна тамоў кніг.

Мантаж стэлажоў асноўнага кнігасховішча бібліятэкі рабілі майстры вучэбных майстэрань універсітэта з дапамогай студэнтаў фізічнага факультэта.

## Замежныя журналісты ў БДУ

Пазаўчора Беларускі дзяржаўны універсітэт наведалі замежныя журналісты, акрэдытаваныя ў Маскве. Госці мелі гутарку з рэктарам БДУ акадэмікам А. Н. Сеўчанкам. Потым яны пабывалі ў аўдыторыях, лабараторыях, гутарылі са студэнтамі.



Гэты здымак зроблены ў пачатку сесіі на матэматычным факультэце. Выкладчык Генадзій Станіслававіч Кемброўскі прымае залік па малекулярнай фізіцы ў студэнта 2 курса матфака Віктара Карзюка.

Фота студэнта Івана ТРУХАНА

## Парада цаліннiку

Мы раім тым, хто едзе на цаліныя навабудоўлі, узяць з сабой наступныя рэчы, якія пастаянна бываюць патрэбны.

**Камплект пасцельных рэчаў (2 коўдры, падушка, верхняя і ніжняя навалачка і г. д.),**

**ватоўку,**

**шалік,**

**шапку, а таксама кепку (берэт),**

**рабочы касцюм,**

**2 змены бялізны,**

**2 рушнікі,**

**пару спартыўнага абутку (кеты, тапачкі),**

**пару кірзавых ботаў (лепш), або пару лыжных чаравікоў (горш), або пару гумавых ботаў (яшчэ горш),**

**2 пары цёплых шкарпэтак, а таксама 2 пары простых шкарпэтак.**

**прыладак для галення і запас лязоў,**

**набор рэчаў туалету (мыла, зубны парашок, зубную шчотку, грабянец, адэкалон),**

**міску, лыжку, конаўку,**

**рукзак або чамадан,**

**ніткі, іголкі, запасныя гузікі,**

**набор пісьмовых прылад (аўтаручку, канверты, паперу, маркі).**

## *Творчасць нашых сяброў*

Дарагія чытачы! Сёння мы знаёмім вас з творчасцю студэнтаў некалькіх вышэйшых навучальных устаноў краіны. Прапануем вашай увазе вершы студэнтаў Саратаўскага універсітэта і Уральскага політэхнічнага інстытута і апавяданне студэнта Казанскага універсітэта.

### МИНСК — МОЯ РОДИНА

**Минск — моя родина светлая,**
**Дорогая моя Беларусь!**
**У меня есть мечта заветная:**
**Скоро, скоро к тебе вернусь.**
**Я не помню твои развалины,**
**Груды щебня, осколки, шрапнель.**
**Этот город, войной израненный,**
**Заглянул ко мне в колыбель,**
**И не с песней — со свистом режущим,**
**Когда город стонал в бреду, —**
**Засыпал на руках я в убежище**
**В этом первом моем году.**
**Знаю, стал ты теперь красивее,**
**Словно не было горьких лет;**
**Улыбается небо синее**
**Мирным окнам твоим в ответ.**
**Каждый камень от счастья жмурится.**
**И от счастья смеется гранит,**
**Потому что на каждой улице**
**Каждый камень был горем полит.**
**О тебе, как о друге, думаю,**
**Не скрываю мужскую грусть.**
**Будьте счастливы, улицы шумные,**
**Будь счастливой, моя Беларусь!**

Дмитрий **РУСАНОВИЧ.**

(З газеты «За индустриальные кадры» Уральскага політэхнічнага інстытута імя С. М. Кірава).

### *ГИМН РЫЖЕГО*

Ну да, — я рыжий!
Я весь огонь!
Водою, слышишь,
Меня не тронь.
Я рыж, как солнце!
Вглядись в меня:
Ведь я — кусочек
Его огня.
Колючий волос
Огнем облит,
Горячий голос,
Как медь, звенит...
А разве плохо
Встречать во мгле
Меня, как факел,
Всего в огне?
Дорогу видеть,
По ней шагать
И ненавидеть,
И побеждать?!
А искры наши,
Забравшись в стих,
Зажгут кострами
Сердца других.
Я весь, как солнце!
Я создан им,
Чтоб жить
И в жизни
Светить другим!

**М. ХАРХАРДИН**

(З газеты «Ленинский путь» Саратаўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. Г. Чарнышэўскага).

**К. БЕРДИЧЕВСКИЙ**

### Я УЧУСЬ РИСОВАТЬ

МАЛЕНЬКИЙ РАССКАЗ

Сегодня, роясь в столе, я наткнулся на пачку пожелтевших рисунков. Я был еще совсем маленьким, когда мне подарили цветные карандаши, Мне казалось, что из всех карандашей рисовать можно только одним. Я зажмуривал глаза и, замирая, вынимал карандаш. Иногда мне попадался синий, и тогда все дома и люди, и листья на деревьях — все было синим. Я рисовал синее солнце. В небе плыли черные бомбардировщики, а по земле ползли зеленые танки.

— А это что? — спрашивала меня мама.

— Это дом, а это труба. Из трубы идет дым.

— Глупый, разве дым бывает зеленым? Дым бывает серым.

Я гляжу в окно. Из трубы идет дым. Он белый. Рядом другая труба. Из нее течет синий дым. А там, где светит солнце, дым совсем розовый.

—Глупый, — говорю я себе. — Разве дым бывает синий? И снова перебираю пожелтевшие детские рисунки.

Вот плывет пароход по желтому морю. Я стою на мостике в капитанской фуражке и смотрю далеко вперед.

— Папа, — говорит мне мой сын, — смотри, у меня тоже есть пароход.

Я гляжу на рисунок. Плывет пароход. Из грубы течет синий дым.

— Глупый, разве бывает дым синим?

— Правильно, не бывает. И делает дым зеленым.

(З газеты **«Ленінец»** Казанскага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Ульянава-Леніна).

## *Аддзел Данілы Шылы*

## Павучальная гісторыя ў дакументах з каментарыямі

«Растлумачальная запіска.

Я, Кур'яновіч Тацяна Аляксандраўна, сапраўды брала кнігу «Асновы марксісцка-ленінскай эстэтыкі», год выдання 1959. Гэтую кнігу я брала не першая і яна была сапсавана ўжо да мяне.

Я не згодна з абвінавачаннем.

Т. Кур'яновіч.

21 мая 1963 г.»

«Растлумачальная запіска

Я, студэнтка 3 курса хімічнага факультэта, парушыла правілы карыстання бібліятэчным фондам, а ім.: сапсавала кнігу «Курс лекцый па палітэканоміі». Гэта здарылася таму, што дзяўчына з пакою ўзяла гэтую кнігу і, не паглядзеўшы на штамп, мяркуючы, што гэта яе асабістая, падкрэсліла чарнілами радок у радок 10 старонак. Я ж вымушана была несці яе ў бібліятэку, бо ў магазінах такога падручніка не было. У бібліятэцы, зразумела, гэтую кнігу не прынялі і не аддалі яе назад; я ж са свайго асабістага фонду выдзеліла вызначаную суму і падручнік «Палітэканомія» ужо здала замест «Курса лекцый».

(Неразборлівы подпіс).

22 мая 1963 г».

Гэтыя два дакументы напісаны дзвюма студэнткамі нашага універсітэта — пяцікурсніцай філфака Таней Кур'яновіч і трэцякурсніцай хімфака Нінай Дасюкевіч. Напісаны яны прыкладна з аднолькавай прычыны: бібліятэка галоўнага корпуса універсітэта патрабавала ад студэнтак вярнуць узамен сапсаваных імі кніг новыя. Патрабаванне зусім правільнае, бо і Кур'яновіч, і Дасюкевіч прынеслі ў бібліятэку кнігі зусім не ў тым выглядзе, у якім яны атрымлівалі.

Але звярніце ўвагу на адносіны іх да гэтай справы. Калі Дасюкевіч чэсна прызнала віну і робіць усё, каб выправіць памылку, то Кур'яновіч ставіць «пытанне рабром»: вінавата яна ці не. Не ведаем, як хто, а мы лічым Таню Кур'яновіч удвая вінаватай. Яна не першы год ужо вучыцца ў ВНУ, павінна выдатна ведаць правілы карыстання бібліятэкай. А там, між іншым запісана, што **«чытач павінен пры атрыманні кнігі праверыць стан яе і пры абнаружэнні дэфектаў тут жа паведаміць бібліятэкару. Інакш адказнасць кладзецца на таго, хто здае кнігу апошнім».** Так што, Таня, няма чаго звальваць віну з хворай галавы ды на здаровую. Згаджайся, не згаджайся «з абвінавачаннем», а адказваць усё ж прыдзецца.

Можна было б і спыніць на гэтым размову аб кнігах бібліятэчных і аб правілах карыстання бібліятэкай, калі б не яшчэ адзін дакумент, які выклікае вялікую трывогу.

**«Спіс студэнтаў, парушаючых правілы бібліятэкі»** — так ён называецца і састаўлен бібліятэкарамі. У спісу 12 прозвішчаў: Анатоль Таран (3 курс геафака), Дора Шнейдар (4 курс фізфака), Ванда Пудзіноўская (1 курс геафака), Аркадзь Кісялёў (3 курса гістфака), Тацяна Кур'яновіч (5 курс філфака), Валерый Аксёнаў (3 курс фізфака), Лідзія Жабрак (1 курс біяфака), Міхаіл Голубеў (6 курс завочнага гістфака), Анатоль Змітровіч( 5 курс матфака), Крыстын Гацко (2 курс геафака), Людміла Ярмола (2 курс біяфака), Ніна Дасюкевіч (3 курс хімфака). Кнігі з вырванымі старонкамі, з малюнкамі, надпісамі, падкрэсленымі радкамі — вось што яны прынеслі ў бібліятэку. І гэты спіс быў складзены літаральна за некалькі дзён. Некалькі прозвішчаў з яго ўжо сустракаліся ў нашай газеце, у заметцы «Скарга пяці кніжак».

Толькі дзіву даешся, як гэта дарослыя людзі, якія прыйшлі ў вышэйшую навучальную ўстанову атрымаць веды, дагэтуль не ведаюць элементарных норм паводзін, адносін да дзяржаўнай маёмасці. Калі яны не хочуць разумець сваёй адказнасці, то дэканаты, партыйныя і камсамольскія арганізацыі павінны паставіць іх на шлях сапраўдны.

**Даніла ШЫЛА.**

## ПЕРАМАГЛІ ВЕЛАСІПЕДЫСТЫ БДУ

Чатыры дні праходзілі спаборніцтвы на прыз газеты «Знамя юности». Яны закончыліся пераканаўчай перамогай студэнтаў універсітэта ў групе калектываў фізічнай культуры.

У першы дзень у групавой гонцы на 100 кіламетраў першым фінішаваў Георгій Расацкі. Прадстаўнік БДУ Анатоль Марачкін прыйшоў трэцім.

У праграме другога дня спаборніцтваў была зноў групавая гонка на 100 кіламетраў. Лідэрам па суме двух дзён зноў застаўся Г. Расацкі, але Анатоль Марачкін перамясціўся на месца вышэй.

50-кіламетровую індывідуальную гонку — спаборніцтвы трэцяга дня — выйграў А. Марачкін і па суме трох дыстанцый выйшаў уперад.

Апошні дзень спаборніцтваў прынёс канчатковую перамогу камандзе універсітэта. У асабістым заліку ў апошняй групавай гонцы на 100 кіламетраў перамог Г. Расацкі, але яму не хапіла для перамогі над Марачкіным 14 секунд. Анатоль Марачкін прайшоў 350 кіламетраў з агульным часам 9 гадзін 5 мінут 51 секунда. Леанід Марачкін — брат Анатоля — быў трэцім

**За рэдактара Я. ЛЯХАЎ.**

**Адрас рэдакцыі:**
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 04343. Тыр. 2000. Зак. 2026.